Следует подчеркнуть, что английский язык стал главным образом языком межкультурного общения не потому, что англичане или американцы выше других по интеллектуально-познавательным возможностям. Причина здесь кроется в том, что именно так распределились исторические, объективные обстоятельства в эпоху глобализации.

Но, как показывает практика, большую роль играют и субъективные факторы (*часто именно родители определяют выбор ребенка в изучении иностранного языка*). Наблюдается переход школ на изучение английского языка. Не умаляя роли английского языка, мы считаем эту тенденцию в образовании ошибочной, мы поддерживаем положения «вариативности», «многообразия» в изучении иностранных языков.

Как отмечает профессор политических наук, директор Центра европейской политики университета Бремена М. Цорн, термин «глобализация» не учитывает то важное обстоятельство, что процессы объединения, на которые обычно ссылаются ее сторонники, пока охватывают не более 30% стран мира, а значит, не являются истинно «глобальными».

Немало экспертов, теоретиков, политиков, простых граждан солидаризируются с общим выводом: в глобализации «побочные, негативные последствия куда более весомы, чем позитивные влияния» [9, с. 18]. «Как совокупный многомерный процесс» глобализация необратима; но хотя глобализация безальтернативна, ее процессы все же вариабельны [10].

**Список цитированных источников**


1. Kirkworod, T.F. Our Global Age Reguires Global Education: Clarifying Definitional Ambiguities // The Social Studies. – Vol. 92. – No.I. – P. 10-15.
2. Stolfi, F., Sussman G. Telecommunications and Transnationalism: the Polarization of Social space // The Information Society. – 2001. – Vol. 17. – P. 49-62.
3. Tomaserski, K. Changing the Global Fate of Education: Only Rights Can Halt and Reverse Wrongs // Education International. – 2001. – Vol. 7 – No. 2 – P. 485.
4. Володин, А.Г., Широков, Г.К. Глобализация: истоки, тенденции, перспективы / А.Г. Володин, Г.К. Широков // Полис. – 1999. – № 5. – С. 84-102.
5. Сусоколов, А.А. Структурные факторы самоорганизации этноса / А.А. Сусоколов // Расы и народы. – 1990. Вып. 20. – С. 5-39.
6. Альтбах, Ф. Высшее образование и WTO / Ф. Альтбах // Альма-матер: Вестник высшей школы. – 2001. – № 6. С. 39-42.
7. Макбурни, Г. Глобализация: новая парадигма политики высшего образования / Г. Макбурни // Высшее образование в Европе. – 2001. – № 1. – С. 47-55.
8. Starkey, H. Subject – based approaches to global education in G. Pike and D. Selby. Global teacher, global learner. London: Hodder and Stroughton, 1988.
9. Dahrendorf, R. Anmerkung zur Globalisierung im Alltag. – Fr.a. / M., 2002.
10. Диалог культур в глобализирующемся мире: мировоззренческие аспекты / отв. ред. В.С. Степин, А.А. Гусейнов. – М., 2005.


# РЭФОРМА ГРАМАДСКІХ УМОЎ ВЫТВОРЧАСЦІ І ДАБРАБЫТ ЯК ШЛЯХ ДА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ТРАНСФАРМАЦЫІ НА ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У 1926 – 1939 ГГ.: АГУЛЬНАЯ МЕТАДАЛАГІЧНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ ПІЛСУДЧЫКАЎ


А.П. Дзмітрук

*Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Баранавічы, Беларусь*


Урад маршала Ю. Пілсудскага і праф. Бартэля першай сваёй задачай пасля прыходу да ўлады абвясціў эканамічнае адраджэння дзяржавы і рэальную рэформу ўмоў існавання шырокіх народных мас шляхам інтэнсіфікацыі вытворчасці, якая магла б забяспечыць ім сталае паляпшэнне быту. Кардынальным злом лічылі ўбогасць гара-

доў і вёсак, іх жыхароў, якая выклікала немагчымасць развіцця прамысловасці, што ў сваю чаргу было звязана з нізкім спажываннем перш за ўсё сялян, а ўсё разам вяло да праблем скарбу з-за нізкай плацежаздольнасці. Супрацьстаяць паўперызацыі вырашана праз стварэнне для сельскай гаспадаркі ўмоў, якія б забяспечылі ёй квітненне і развіццё, а думаць пры гэтым не столькі пра буйную, але перш за ўсё пра дробную ўласнасць, якая наскрозь была натуральная, не звязаная з рынкам [1, с. 180 – 181].

Але як выконваць так пастаўленыя ўрадам задачы на заходнебеларускіх землях, дзе селянін, які праводзіў самастойную дробную гаспадарку, асноўны вытворца гэтых зямель «іншамоўны, нацыянальна слаба акрэслены схізматык» [2, с. 143]. Павышаць і яго дабрабыт? Навуковая ацэнка наступстваў і дэтальная распрацоўка гэтай праблемы прадстаўлены ў працах Інстытута даследавання гаспадарчага стану ўсходніх зямель пры Музеі прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў Варшаве; якія выконваліся пры фінансаванні ўрада [3, с. 20]. У перыяд з 1927 па 1929 гг. былі выдадзены чатыры тамы навуковых прац, сярод якіх асаблівую ўвагу прыцягвае даклад генеральнага сакратара Інстытута С. Арсіні-Росенберга, агучаны 9 ліпеня 1927 г. на агульна-гаспадарчай секцыі, які знайшоў падтрымку не толькі навуковай інтэлігенцыі, але і міністра сельскагаспадарчых рэформаў – «Праблема сувязі гаспадарчай палітыкі і грамадскай тэхналогіі на ўсходніх землях Рэчы Паспалітай». Фактычна ён паклаў метадалагічную аснову не толькі даследаванняў заходнебеларускіх тэрыторый, але і дзейнасці мясцовай адміністрацыі. Прапаную засяродзіцца на яго аналізе.

Зыходнай стала ідэя, што дабрабыт – гэта, з аднаго боку, умелая вытворчасць, з другога – яна не існуе без мэтанакіраванага, рацыянальнага кіравання сіламі і сродкамі. На заходнебеларускіх землях «тэхналагічныя» праблемы (гэта значыць кіравання) паставілі на першае месца па двух прычынах: 1) этнічна разнароднае насельніцтва і ўладкаванне, якое «складалася з першасных груп», што выклікала патрэбу пераўтварэнняў, з аднаго боку, і спецыфічных метадаў уздзеяння, з другога [2, с. 121]; 2) заходнебеларускія землі былі бедныя на прыродныя выкапні, капітал, таму галоўны націск вырашана пакласці на добрую арганізацыю працы [2, с. 122].

Да гаспадарча адмоўных грамадскіх фактаў на «ўсходніх землях» (пад якімі разумеліся Віленскае, Навагрудскае, Палескае, Валынскае ваяводствы) залічылі: 1) саслоўнае ўладкаванне, якое захавалася ў групавой псіхалогіі шырокіх слаёў; 2) класавы антаганізм, які прыводзіў да дэзарганізацыі вытворчых груп і зніжэння вытворчасці; 3) нацыянальныя і рэлігійныя антаганізмы, якія паглыналі шмат грамадскай энергіі; 4) шырока прымяняемы пратэкцыянізм; 5) некаторыя гаспадарча адмоўныя рысы мясцовага насельніцтва, якія перадаваліся шляхам грамадскай традыцыі маладым пакаленням; 6) дрэнна ўрэгуляваныя адносіны ў вытворчых групах [2, с. 125–126]. Прапаноўвалася ліквідаваць перажыткі саслоўнай псіхалогіі і створанай бальшавікамі; паслабіць нацыянальныя, рэлігійныя, класавыя антаганізмы; часткова ліквідаваць пратэкцыянізм, што павінна было прывесці да гаспадарча карыснага грамадскага выхавання і рацыяналізацыі вытворчай арганізацыі, вызвалення творчых сіл асобы ў атмасферы рэальнага дэмакратызму. З пункту гледжання сацыялогіі ўсяго гэтага было б дастаткова для павышэння эфектыўнасці вытворчасці, а значыць, і дабрабыту.

З аднаго боку, прызналі, што сепаратыўны рух (*беларускі – Е. Д.*) не магчыма было ліквідаваць паліцэйска-адміністратыўнымі сродкамі; з іншага – адмовіцца ад пратэкцыяналізму (*у адносінах да палякаў – Е. Д.*), які практыкаваў урад і польскае грамадства, можна было толькі часткова і селектыўна, па меры фарміравання і ўзмацнення ў іх натурнай здольнасці да спаборніцтва, пры адначасовым выкараненні неэтычных сродкаў барацьбы у груп «праўна і фактычна недаразвітых» [2, с. 126]. Але каб звесці класавыя антаганізмы да мінімума, трэба было шмат часу і гарманічнага супрацоўніцтва, «грамадскага выхавання і рацыянальнай арганізацыі вытворчых груп».

З усяго гэтага не зусім зразумела, як ліквідацыя супярэчнасцей магла прывесці да павышэння вытворчасці і дабрабыту. Аднак прапаную прааналізаваць, што разумелі пад рацыянальнай арганізацыяй вытворчых груп і грамадскім выхаваннем.

Зыходзячы з таго, што на заходнебеларускіх землях большасць вытворчых груп сельскагаспадарчыя, галоўным аб'ектам уздзеяння сталі фальваркі і самастойныя дробныя гаспадарства. Прычынай знішчэння дабрабыту ў гады расейскай рэвалюцыі 1905 г. крэсавыя землеўласнікі бачылі ў групавых канфліктах у вытворчай групе – бунтуючыя работнікі не толькі тармазілі вытворчасць, але ў шматлікіх выпадках поўнасцю знішчалі прадпрыемства. Навукоўцы рэкамендавалі ў першую чаргу кардынальна змяніць адносіны паміж работнікамі і ўладальнікамі фальваркаў праз нарматыўнае ўрэгуляванне (падпісанне дагавораў, кантрактаў). Схемы адносін унутры вытворчай групы павінны былі стаць яснымі, дакладнымі, аб'ектыўна-культурны змест узаемных абавязкаў не павінен быць спрэчным з гарманічным супрацоўніцтвам членаў адносін; этычныя нормы павінны былі ўдакладняць нарматыўна-прававыя, звычаі і статутовыя. Грамадскае выхаванне і агульную арганізацыю трэба было накіраваць на абмежаванне да мінімума канфліктаў, якія правакаваліся з аднаго боку цямнотай і адсутнасцю этыкі ў работнікаў, другія – прадпрымальнікам і яго памочнікамі, трэція – з-за агітацыі дэмагогаў або кар'ерыстаў. У сувязі са складанасцю працэсу распаду вытворчай групы, які адбываецца пад уздзеяннем разнародных фактараў, тэхніка змагання з ім павінна стаць разнароднай і складанай. Але першачарговай справай стала выхаванне, якое павінна было ахапіць не толькі рабочы клас, бедную інтэлігенцыю, але і землеўласнікаў, якія лічылі сябе і лічыліся ў рэгіёне не прафесійнай групай, але саслоўем [2, с. 134-135]. Акрамя гэтага, прадпрымальнік павінен наладзіць супрацоўніцтва з больш шырокай групай (самакіраваннем або дзяржавай) [2, с. 142].

Другім аб'ектам уздзеяння сталі дробныя самастойныя гаспадаркі, дзе ўласнік толькі ў выключных выпадках карыстаўся наёмнай працай, што радыкальна змяняла тып грамадскіх адносін у вытворчай групе. Характэрнай розніцай, якая прываблівала навукоўцаў, стала тое, што сувязі паміж членамі дадзенай групы ствараліся не на грунце ўмовы, але на падставе кроўных сувязей, і ў выніку ўзаемныя правы і абавязкі членаў групы акрэслівалі не схемы дагавора, але звычаі. Нават асобы, якія працавалі па дагавору, трактаваліся як члены сям'і.

Адносіны ўнутры групы акрэсліваліся сямейнымі нормамі, а ў выніках вытворчасці ўдзельнічалі пасрэдна або непасрэдна ўсе члены групы, што выклікала наступствы: уласнік меў большую свабоду ў кіраванні, чым прадпрымальнік, у імя паслушэнства, у імя агульнага дабрабыту ён мог патрабаваць ад працаўніка большых паслуг, чым у дагаворы паслуг найму, а санкцыі за непаслушэнства нязмерна большыя, чым у фальварачнай групе, у той жа час класавыя антаганізмы слабейшыя [2, с.143]. Калі такую групу ахопліваў канфлікт, праяўляліся рысы разлажэння, то яны адначасова ахоплівалі і сямейны ўклад, што на заходнебеларускіх землях адбываецца рэдка.

На думку сацыёлагаў, тры асноўныя фактары ўплывалі на павышэнне прадукцыйнасці такіх гаспадарак. Па-першае, максімум вытворчасці дасягаецца тады, калі асоба зацікаўлена ў выніках сваёй працы, што адбываецца ў двух выпадках: а) працаўнік, нягледзячы на сталую нізкую аплату атрымоўвае дадаткова высокую ўзнагароду, прапарцыянальную тым намаганням (што ў існуючай сітуацыі на заходнебеларускіх землях было немагчыма); б) калі асоба з'яўляецца ўладальнікам прадпрыемства і ўдзельнічае поўнасцю у станоўчых і адмоўных выніках сваёй працы.

Па-другое, на прадукцыйнасць аказвае ўплыў прагрэс прафесійных сельскагаспадарчых ведаў. Але аб рэальным іх развіцці ў краі выраша не высокі, нават, хаця б быў найлепшы, узровень ведаў некаторых, нешматлікіх асоб (уладальнікаў, арандатараў, адміністратараў фальваркаў), але ўзровень гэтых ведаў у шырокіх сельскагаспа-

дарчых колаў, т. зв. дробных гаспадароў. Для яго дасягнення не дастаткова засноўваць і ўдасканальваць прафесійныя школы, павінна адбывацца мэтанакіраванае і масавае ўздзеянне. Але гэтую ролю польскія землеўласнікі не маглі выконваць, бо вынікі выхаваўчай дзейнасці вырашаюць два моманты: сімпатыя (пачуццё на грунце прыналежнасці да падобных і прыязных груп), павага (прызнанне больш высокага ўзроўню ў якой-небудзь галіне і адпаведнае падпарадкаванне), эмацыянальная гармонія і падпарадкаванне, што амаль немагчыма зрабіць паміж селянінам-схізматыкам і шляхціцом-католікам-абшарнікам (нават прафесіі неідэнтычныя, бо сяляне не прызнаюць пана хлебаробам). У выніку прапаноўвалася іншая група – асаднікі – «культурна вышэйшая», і, нягледзячы на тое, што з'яўляліся католікамі і палякамі, але блізкія да мясцовых сялян. Такім чынам, замест праблематычнай узаемасувязі ствралася рэальная эфектыўная, якая магла паўплываць на прагрэс сельскагаспадарчых ведаў. Але піянеры-асаднікі самі патрабавалі прафесійнай асветы. Даць ім яе маглі польскія двары, такім чынам, атрымоўвалася рацыянальная траістая выхаваўчая арганізацыя: культурны ўплыў некалькі тысяч двароў праз гаспадаркі асаднікаў дасягаў да прымітыўных сялянскіх гаспадарак [2, с.145].

Па-трэцяе, лічылі, што нават на ўласнай зямлі праца не можа быць інтэнсіўнай і прадукцыйнай, калі ўладальнік не мае упэўненасці ва ўладанні. Яна з'яўляецца фактарам, які дапамагае сацыялізацыі і развіццю патрэбных маральных якасцей. Праз набыццё ўласнасці асоба не толькі ўваходзіла ў новыя адносіны і набывала новыя правы і абавязкі, але і існуючыя да гэтага адносіны пачынала інтэрпрэтаваць паіншаму. Уласнасць навязвала новы ідэал грамадскіх паводзін [2, с.146].

У чым жа ён заключаўся, становіцца зразумелым, толькі калі пачнем аналізаваць метады, з дапамогай якіх павінна было праводзіцца грамадскае выхаванне. У гэтай сувязі звярнулі асаблівую ўвагу на бліжэйшае акружэнне, г. зн. бацькоў. Аўтары канцэпцыі лічылі, што іх задачай на сучасным этапе з'яўляецца не ўзбагачэнне дзіцяці ведамі і навыкамі тэхнічнымі і гаспадарчымі, бо гэтыя задачы лепш і больш поўна рэалізоўвала прафесійная школа (часткова вытворчая група), але такое грамадскае выхаванне асобы, каб чалавек годна мог выконваць будучую ролю кіраўніка, або выканаўцы гаспадарчай працы. Як ужо адзначалася, для дробнага гаспадарства важна большае падпарадкаванне, паслушэнства [2, с.143]. Акцэнт зроблены на ідэі больш эфектыўнага ўплыву групавой волі на асобу, чым наадварот.

Не менш важнай стала пазашкольная асвета – друк, літаратура, арганізацыя чытання, арэнда кніг, лекцыі, кінематограф і г.д., што дазваляла ўздзейнічаць і на дарослых. У выданнях для «ўсходніх зямель», лекцыях, паказах ставілася мэта перасунуць пункт цяжкасці з класавых і палітычных задач на гаспадарчыя, прапаганду дэпалітычных, вобразаў, каб не было паэтызацыі ілжы, злачынства, а наадварот, прысутнічалі ідэі замілавання працай, шляхетнага супрацоўніцтва. Але прапанавана выкарыстаць і імкненне дарослай асобы ў залежнасці ад сферы, маёмаснага стану, здольнасцей і схільнасцей, асабістых момантаў ўваходзіць у новыя грамадскія адносіны з новымі асобамі і групамі, якія могуць уздзейнічаць на яе пасрэдна, або непасрэдна. Такім чынам, гэта адкрывала магчымасці для працы сярод іх «новых асоб» асаднікаў, блізкіх па статусу, і іх арганізацый.

На думку аўтараў канцэпцыі, калі некаторыя катэгорыі насельніцтва, кампактна пражываючыя на пэўнай тэрыторыі, сутыкаліся з адмоўнымі ўмовамі ўдзелу на роўных у культурным жыцці палякаў, то яны імкнуліся супрацьпаставіць ёй уласную, што садзейнічала фарміраванню беларускага народа [2, с. 151]. У практычнай дзейнасці вырашана было выкарыстоўваць «прывабнасць» «вышэйшы статус» польскай культуры і ўцягваць у яе арбіту астатняе насельніцтва, каб не ствараць такога роду сепаратызму. У такіх умовах у якасці найлепшага сродку было б фактыч-

нае раўнапраўе, але яго дазвалялася надаваць толькі ў галіне культуры, але ні ў якім выпадку ў гаспадарчым ці палітычным. Пры гэтым «ліквідацыя пратэкцыянізму не можа адбыцца адразу, бо гэта б выклікала небяспечны грамадскі і гаспадарчы шок» [2, с. 150 – 151]. «...такая «дзяржаўная асіміляцыя» (у адрозненні ад этнічнай) будзе лагічным працягам ідэі Ягелонаў і вызваліць прыродныя здольнасці палякаў, [...] забяспечыць ім сталае і рэальнае лідэрства ў галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры» [2, с. 151]. Але «...дэмакратызацыя ўсходніх зямель павінна ісці павольна, раўнамерна з развіццём грамадскіх пачуццяў і паняццяў і ліквідацыяй анарха-ахлакратычных імкненняў (*камуністычных? – Е. Д.*); радыкальная і ранняя дэмакратызацыя [...] вядзе да дэзарганізацыі вытворчых груп і поўнага ўпадку вытворчасці» [2, с. 135]. Фактычна «прававую фікцыю, якая знешне выступае ў праўна-палітычных адносінах паміж грамадзянамі дзяржавы» і «рэальную роўнасць, што праяўлялася ва ўладкаванні культурнага жыцця» – вось што разумелі пад дэмакратыяй [2, с. 135].

Найбольшым клопатам стваральнікаў канцэпцыі стала пытанне: ці не стануць рацыянальна добра арганізаваныя вытворчыя дробныя гаспадарства асновай для будучай беларусізацыі, ці украінізацыі? Пры даследаванні прыйшлі да высновы, што моц асобных малых вытворчых груп абмежавана. «Найлепшая арганізацыя і найлепшае функцыяніраванне вытворчай групы не дапамогуць, калі распадам ахоплена больш шырокая група, тая, ў полі якой вытворчая група складае меншую, падпарадкаваную ўладкаванню. Агульнаму распаду нельга супрацьпаставіць частковую санацыю» [2, с. 140]. Крыніцай з'явы разрыхлення і знікнення грамадскіх вузлоў з'яўляецца «псіхалагічны канфлікт, які ствараецца ва ўмыслах асоб пад уплывам спрэчных імкненняў». Акрамя гэтага, лепшым спосабам разбіць адзінства групы прызнана фарміраванне ў яе лоне новых непрадбачаных арганізацыйных і варожых меншых груповак [2, с. 119].

Так, прыхільнікі Ю. Пілсудскага шырока выкарыстоўвалі ў прапагандзе лозунгі павышэння дабрабыту, заснаваным на замацаванні права ўласнасці, але пазбягалі выкарыстання апошняга тэрміну. Замест гэтага ствараліся слоўныя, а лепей сказаць, прававыя канструкцыі, полісемантычныя, якія дазвалялі пад прывабнымі лозунгамі праводзіць неабходную ўладам палітыку. Ва ўмовах дамінавання на гэтых тэрыторыях камуністычных ідэалаў толькі так скрыта пастаўленыя мэты маглі быць эфектыўнымі.

З аднаго боку, аўтар канцэпцыі ўсімі сродкамі імкнецца пераканаць нас, што яго задачай з'яўляецца выкараненне класавага антаганізму. З другога, аналіз арганізацыйных формаў вытворчых груп даказвае зваротнае. Класавы антаганізм землеўласнік – селянін прадстаўлены ў выглядзе двух тыпаў груп – фальварка і дробнай сялянскай гаспадаркі. Праблема паслядоўна вырашаецца толькі ў адносінах да першай. Нягледзячы на тое, што рэкламуючы свае ідэі, аўтар абвяшчае аб ідэальнасці і бесканфліктнасці дробнай гаспадаркі, з ім можна пагадзіцца толькі часткова. Яна такая толькі ўнутры групы, якая з'яўляецца адначасова і вытворчай і кроўнай (сямейнай), але прывіццё прыватнай уласнасці ў яе садзейнічала маёмаснаму расслаенню заходнебеларускай вёскі і да канфлікту паміж дробнымі гаспадаркамі, што апасродкавана біла па нацыянальнаму адзінству беларусаў, а спосабаў іх памякчэння нідзе ў працы не сустрэнем. Самі выбраныя тыпы гаспадарак паміж сабой канфліктныя, а «спосаб гарманізацыі» адносін паміж імі падаецца праз іерархічнае падпарадкаванне (праз выхаваўчую сістэму і прафесійную дзейнасць, але на розных узроўнях). Акрамя гэтага, шлях дасягнення дабрабыту быў розным: для фальварка – праз паляпшэнне кіравання, для дробнай гаспадаркі – праз добрую арганізацыю працы.

А вось аналіз грамадзянскага выхавання паказвае, што калі ў адносінах да фальварка яно абмяжоўвалася маральна-этычнымі ўказаннямі і адмовай ад некаторых тэрмінаў, то ў адносінах да селяніна яго метады былі складзены ў цэлую канструкцыю,

сістэму з мэтай паслядоўнага ўздзеяння на яго свядомасць на розных узроўнях, праз розныя сродкі. Але для чаго ў канцэпцыі спатрэбіліся асаднікі? Фактычна пры выразных канфліктах і рысах разлажэння нацыянальнай групы іх мэтай стала селекцыя з вясковага асяродку маёмасных слаёў, падпарадкавання іх сваім гаспадарча-культурным уплывам праз пашырэнне сярод іх сельскагаспадарчых ведаў, далучэнне да «вышэйшай» культуры. У далейшым гэтая паланізаваная група мясцовых лідэраў уцягвала ў арбіту астатняе беларускае насельніцтва, але гэтыя справы распрацоўваліся ўжо ў іншых дакументах пілсудчыкаў.

Такім чынам, яскрава бачна, што выпрацаваная па загаду ўрада Ю. Пілсудскага агульная канструкцыя павышэння дабрабыту ў спалучэнні з рацыянальнай арганізацыяй вытворчых груп і рэформай грамадскага выхавання накіравана не толькі на ліквідацыю саслоўна-класавай, але і нацыянальнай праблемы на заходнебеларускіх землях праз паланізацыю падчас сацыялізацыі і развіцця «патрэбных маральных якасцей» сялян.

**Спісак цытаваных крыніц**

1. Staniewicz, W. O program agrarny w Polsce i jego wykonanie: mowy i przemówienia (1926 – 1928) / W. Staniewicz. – Warszawa: Nakładem Ministerstwa Reform Rolnych, 1928. – 243 s.

2. Orsini-Rosenberg, S. Zagadnienia styczne polityki gospodarczej i technologji społecznej na Ziemiach Wschodnich Rzeczypospolitej / S. Orsini-Rosenberg // Prace Instytutu Badania Stanu Gospodarczego Ziem Wschodnich. – Warszawa, 1927. – S. 106 – 153.

3. Muzeum przemysłu i rolnictwa w Warszawe 1875 – 1929 / [Muzeum przemysłu i rolnictwa w Warszawe]. – Warszawa, 1929. – 21 s.

## ТРЕТЬЯ ПРОМЫШЛЕННАЯ РЕВОЛЮЦИЯ КАК ФАКТОР СОЦИАЛЬНОЙ ДИНАМИКИ: ТРАНСФОРМАЦИИ И ИННОВАЦИИ

Д.Г. Доброродний, А.И. Садовская,

*Белорусский государственный университет, г. Минск, Беларусь*

Мир стоит на пороге глобальных перемен. Мировой экономический кризис, глобальный экологический кризис, невозможность дальнейшего неограниченного расходования невосстанавливаемых энергоресурсов, кризис политико-правовой системы, кризис в системах образования и здравоохранения, кризис социальных институтов, духовно-нравственный кризис и прочее – вот реалии сегодняшнего дня. Всё это подталкивает мир к глобальным переменам, но стать их инициатором никто не решается. Страх неопределенности и повторения Великой депрессии в глобальном масштабе парализует политическую волю правителей. Простые обыватели, составляющие основную массу населения, привыкли к высокому уровню социальных гарантий, высокому уровню комфорта и потребления и продолжают требовать от государства их соблюдения, не особо интересуясь издержками и не беря на себя никакой дополнительной ответственности. Эта ситуация активно анализируется и обсуждается в современной философской литературе [1, 2, 4, 5, 6, 8]. Мир находится в «точке невозврата», и как говорил Элвин Тоффлер, «старые способы мышления, старые формулы, догмы и идеологии, несмотря на то, что в прошлом они процветали или были весьма полезными, уже не соответствуют больше фактам. Мир, который возникает с огромной скоростью из столкновения новых ценностей и технологий, новых геополитических отношений, новых стилей жизни и способов коммуникации, требует совершенно новых идей и аналогий, классификаций и понятий. Мы не можем втиснуть эмбриональный завтрашний мир в принятые вчера категории. Ортодоксальные социальные установки или настроения тоже не подходят этому новому миру» [8, с. 21].